Трэба сказаць, што, нягледзячы на шматлікія абавязкі, Жылібер вельмі добра справіўся са сваім заданнем. Батанічны сад, які спачатку налічваў каля 500 раслін, у 1780-м годзе меў ужо за 2000 раслін. У 1781 годзе Жылібер разам са сваімі вучнямі стварыў факультэт медыцыны ў Галоўнай Літоўскай школе ў Вільне. Стаў намеснікам загадчыка кафедры натуральнай гісторыі і батанікі, выдаў два тамы "Флоры Літвы". У пачатку 1783 года ён пакінуў Вільну і выехаў у Варшаву, а потым у Францыю. У Ліёне працаваў эпідэміёлагам, потым займаўся навуковай дзейнасцю. За сваё жыццё Жылібер апублікаваў каля 160 прац па эпідэміялогіі, заалогіі, батаніцы.

Сёння на месцы батанічнага сада знаходзіцца парк. Ён носіць імя вучонага, які стварыў першую на тэрыторыі Беларусі ўстанову вышэйшай адукацыі – Медыцынскую Акадэмію.

Батанічны сад – толькі кропля ў моры гісторыі Гародні. А колькі цікавага і загадкавага есць яшчэ тут, у сэрцы Еўропы, у Беларусі.

**Спіс літатаруты:**


1. Биографическая справка Антоний Тизенгауз / Антоний Тизенгаузен / Гродненский староста. Видный гродненский меценат. http://www.grodno.by /grodno/history/biblio/antoni_tyzenhaus.html
2. Биографическая справка Профессор Жан Эммануэль Жилибер. http://www.grodno.by/grodno/history/biblio/j_emmanuel_gilibert.html
3. История образования на Гродненщине. http://www.grsu.by/ru/university /history/education-grodno-region/
4. Жылібер (Gilibert) http://spadchyna.net/index.php?option= com_content &view=article&id=800:-gilibert-&catid=36:2009-10-27-12-02-55&Itemid=467


# ПОРАЗАЎСКАЕ ГАНЧАРСТВА


УА "Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт"

**Шыманчук Ю.А., 1 к., 26 гр., ЛФ**

Кафедра рускай і беларускай моў

Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Варанец В.І.


І ў дарэвалюцыйнай літаратры, і ў працах савецкіх даследчыкаў ганчарны промысел у Поразаве згадваецца параўнальна рэдка. Магчыма, на гэта паўплывала слава такога буйнога і шырока вядомага ганчарнага цэнтра, як суседнія Пружаны, у "цяні" якога і знаходзілася Поразава. Аднак варта адзначыць, што мясцовыя ганчары наўрад ці ў чым саступалі сваім вядомым суседзям. У 70-80 гг. XIX ст. у Поразаве налічвалася каля 100 майстроў.У дарэвалюцыйны час колькасць іх, як і ўсюды, значна зменшылася, затым зноў прыкметна ўзрасла.



Рэпазіторый ГрГМУ

Паводле дадзеных 1935 года ў мястэчку займаліся ганчарным промыслам 75 сем'яў. Яны супольна выкарыстоўвалі 7 ганчарных печаў. Па ўспамінах старажылаў у гэты перыяд на тэрыторыі Поразава было каля 200 ганчароў, а можа нават і больш. Чаму ж менавіта тут? Адказ просты. Даследаванні паказалі, што тут знаходзіліся і знаходзяцца цяпер буйныя і якасныя запасы ганчарнай сыравіны – гліны. Асноўны паказчык яе – пластычнасць.

Ганчарства ў Поразаве было ў асноўным пабочным ад земляробства промыслам і базіравалася на сямейнай працы. Прафесійныя навыкі і вопыт звычайна перадаваліся ад бацькоў іх дзецям, сваякам на працягу пакаленняў, пагэтаму былі цэлыя сямейна – родавыя дынастыі, такія як Шалкевічаў, Паплаўскіх, Шопікаў, Раманоўскіх, Пінютаў, Козюкаў…

Ганчары жылі амаль на ўсіх вуліцах пасёлка. Нават галоўная вуліца ў Поразаве ( цяпер вуліца Леніна) насіла назву Ганчарная. З 1997 г., у сувязі са смерцю апошняга майстра Шопіка І.І., развіццё чорнаглянцавай керамікі на тэрыторыі г.п. Поразава канчаткова спынена.

У мястэчку Поразава выраблялі чорнаглянцавы( часам нават з сіняватым адценнем) посуд гаспадарчага прызначэння. Чорнаглянцавая кераміка – гэта разнавіднасць чорназадымленай. Гліну нарыхтоўвалі ў бліжэйшым наваколлі, як правіла, восенню, калі заканчваліся сельскагаспадарчыя работы. Гатункі гліны вызначаліся вялікай разнастайнасцю, не ўсе яны былі прыдатныя для ганчарства. Шматвяковы народны вопыт выпрацаваў навыкі вызначэння патрэбнай для работы сыравіны, якая дзялілася на дзве асноўныя групы: высокапластычная (тлустая, жырная) і малапластычная (посная, худая). Якасць гліны вызначалі звычайна навобмацак: расціралі ў пальцах, бралі «на зуб» – тлустая на зубах не трашчала. Адзін са спосабаў быў і такі: тонкую гліняную качалку гарызантальна трымалі ў руцэ. Калі качалка плаўна згіналася – гліна тлустая, калі ламалася – посная. Аднак ніводзін з гэтых гатункаў у чыстым выглядзе не прыдатны для работы. Высокапластычная гліна добра фармуецца, але вырабы з яе не вытрымліваюць высокай тэмпературы. Малапластычная, наадварот, вогнеўстойлівая, але непрыдатная для фармоўкі. Таму рыхтавалася фармовачная маса з тлустай гліны, у якую дабаўлялі непластычныя дамешкі, часцей за ўсё *жарству**. Нарыхтаваную гліну звычайна вытрымлівалі ў *коцаку**. Падрыхтоўка фармовачнай масы рабілася нагамі ці *доўбняй**. Гліну залівалі вадой у драўляным карыце, добра перамешвалі рыдлёўкай, затым на падлозе, пасыпанай жарствой ці пяском, мясілі нагамі да набыцця аднароднай масы. Фармовачную масу без дамешкаў не толькі мясілі нагамі, але і стругалі кавалкам дроту з дзвюма ручкамі па канцах (зрэзка),часам даводку рабілі яшчэ і рукамі. Пры гэтым сыравіна ачышчалася ад смецця, шкодных прымесяў і інш.

Рэпазіторый ГрГМУ

З падрыхтаванай рознымі спосабамі сыравіны фармаваліся невялікія, разлічаныя на выраб адной пасудзіны *клёцы**. Затым кавалак добра вымешанай гліны, мацаваўся на верхнім дыску ганчарнага кола, нагой моцна раскручваўся ніжні вялікі дыск – махавік. Пальцы датыкаліся да кавалка – і ён набываў абрысы пэўнай пасудзіны. Добраму ганчару, каб "выкруціць" збанок ці гаршок, патрэбна 5-10 хвілін. За дзень ён мог зрабіць *капу** гаршкоў. Некалькі сотняў ( ад 300 да 500) падсохлых пасудзін затым закладалі ў ганчарны гарон, там разводзіўся агонь, у якім вырабы напальваліся амаль дабяла. Але перш чым іх закласці ў печ, ганчар *глянцаваў** выраб, наводзіў на паверхню посуду разнастайныя ўзоры. У поразаўскіх майстроў часцей за ўсё гэта былі вертыкальныя і касыя палоскі, рыскі, касая сетка, елачка, паяскі ўзораў, выціснутых зубчастым колцам (карбоўкай). А некаторыя ганчары проста націралі выраб, аздаблялі так называемым суцэльным глянцаваннем.

Далей ішоў абпал вырабаў. Распаліўшы посуд дабяла, у гарон, дакладней у паленнік, які адыходзіў ад яго, падкідвалі смалякі, ядловец і і гарон глуха зачынялі. Якія працэсы далей адбываліся, ганчары, як гэта ні дзіўна, не ведалі і лічылі, што посуд проста задымляецца. Таму і назвалі такую кераміку задымленай. А на самай справе пры гарэнні без доступу паветра з выкарыстаннем смалістага паліва ў гароне стваралася газавае асяроддзе з высокім утрыманнем вугляроду, які ўзаемадзейнічаў з вокісламі жалеза, якія ёсць у гліне, і афарбоўваў вырабы ў чорны, а парой нават у сіняваты колер. Адначасова паляпшалася і іх якасць: змяншалася порыстасць і павялічвалася трываласць. Абпал працягваўся ад 9 да 14 гадзін ( у залежнасці ад пары года, кліматычных умоў). Пасля яго вырабы станавіліся бліскучыя, нібы металічныя, моцныя і не размакалі ад вады. Посуд поразаўскіх майстроў вызначаўся буйнымі, выразна-*прафіляванымі** формамі, падкрэсленым глянцаваным дэкорам. Так як вырабы вялікага промыслу не атрымалі, а знаходзіліся ў стадыі дамашняй вытворчасці, то рыначныя запыты не аказалі на іх вялікага ўздзеяння. Яны пластычныя, лёгкія, дэкаратыўна стрыманыя. Складаныя формы і багаты роспіс для іх не характэрны.

**Спіс літатаруры:**

1. Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. / Беларуск. Савецк. Энцыклап. / Рэкал.: І.П.Шамякін ( гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелСЭ, 1989. – 575 с.: іл.
2. Сахута, Я.М. Беларускае народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва: 2-е выд., перапрац. і дап. / Я. Сахута. – Мн.: Беларусь, 2001. – 110 с.: іл.
3. Сцепанюк, С.В. З гісторыі камплектавання калекцыі поразаўскай керамікі/ С.В. Сцепанюк // Краязнаўчыя запіскі. – 2000. – Вып. 5. – С. 77-81.
4. Волах, В. Мы – прыродныя ганчары/ В.Волах // Свіслацкая газета. – 1991. – 14 верасня.



Рэпазіторый ГрГМУ